**ПРАТАКОЛ**
**І-га пасяджэння Выбарчай камісіі**

*17 лютага 2026 года*

Пасяджэнне Выбарчай камісіі распачынаецца 17 лютага 2026 года ў 21 гадзіну 00 хвілін па мінскім часе (GMT+3). Прысутнічаюць:

*Чальцы Выбарчай камісіі –*

Праслаў Бекіш,
Алена Жылачкіна (Жываглод),
Пётр Маркелаў,
Алена Прыходзька (старшыня пасяджэння),
Дзмітрый Фурманаў.

Пасяджэнне праводзіцца публічна праз відэаканферэнцсувязь. Ход пасяджэння фіксуецца сакратаром Камісіі ў пратаколе. Відэазапіс пасяджэння Камісіі дасяжны на платформе YouTube па адрасе: https://www.youtube.com/watch?v=sgXCF59X2BI.

**<u>На парадку:</u>**

1. Рэпрэзентацыя чальцоў Выбарчай камісіі. Устаноўчая дамова.
2. Асноўная інфармацыя пра выбары ў Каардынацыйную раду IV склікання.
3. Зацвярджэнне рэгламента працы Выбарчай камісіі.
4. Зацвярджэнне Палажэння аб абранні Старшыні Выбарчай камісіі.
5. Абранне старшыні Выбарчай камісіі.
6. Анонс тробаковага Мемарандума аб паразуменні.

**Алена Прыходзька:** Прывітанне, паважанае спадарства! Нам сказалі, што мы ў эфіры, таму вітаем усіх, хто за намі сочыць у рэжыме анлайн, і таксама ўсіх тых, хто будзе глядзець гэтае пасяджэнне ў запісе. Сёння 17-га лютага 19 гадзін па CET, адпаведна 21 і 20 па Мінску і Вільні. І мы пачынаем першае пасяджэнне Выбарчай камісіі па выбарах у Каардынацыйную раду 4-га склікання, Мяне завуць Алена Прыходзька і сёння я буду старшынёй гэтага пасяджэння. І, па-першае, хачу прывітаць і прадставіць маіх калег - сябраў Выбарчай камісіі. Гэта Яраслаў Бекіш, Алена Жылачкіна (Жываглод), Пётр Маркелаў і Зміцер Фурманаў. Камісія сёння ў поўным складзе і калі, калегі, вы не маеце ніякіх запярэчванняў і пытанняў, то я магу аб’явіць нашае пасяджэнне адкрытым.
**Яраслаў Бекіш:** Спадарыня Алена, толькі Вас не бачна.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Тэхнічная замінка. Усё, відаць, добра.
**Алена Прыходзька:** А зараз бачна?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Мы павінны выбраць… ці бачна [сувязь перарываецца].
**Пётр Маркелаў:** Нам трэба браць … паседжанне.. запісваць і весці пратакол [сувязь перарываецца]. Нешта не чую, Алена, нешта не чую.
**Алена Прыходзька:** Я прашу прабачэння, не ведаю, што адбываецца. Скажыце калі ласка, бачна мяне і чутна?
**Пётр Маркелаў:** Агентура блін [смяецца].

**Алена Прыходзька:** Дзякуй вялікі. Не агентура, а гэта, напэўна, я нешта раблю лапкамі. Ну, я тады не буду ўжо паўтарацца, пачынаем наша пасяджэнне. Не дыпфэйк - натуральны чалавек. І я абвяшчу парадак сённяшняга пасяджэння, агенду. Першае пытанне гэта будзе рэпрэзентацыя чальцоў нашай камісіі і таксама абвяшчэнне ўстаноўчай дамовы, якую чальцы камісіі ўсе ўжо падпісалі. Другое пытанне - асноўная інфармацыя пра выбары ў Каардынацыйную раду IV склікання. Трэцяе - зацвярджэнне рэгламента працы Выбарчай камісіі. Чацвёртае - зацвярджэнне Палажэння аб абранні Старшыні Выбарчай камісіі. Пятае - абранне старшыні Выбарчай камісіі. І шостае - анонс тробаковага Мемарандума аб паразуменні. Скажыце калі ласка, калегі, ці ёсць пытанні па агендзе, выказвайцеся калі ласка.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Пытанняў няма.
**Яраслаў Бекіш:** Пытанняў няма.
**Дзмітрый Фурманаў:** Няма.
**Алена Прыходзька:** Тады пераходзім да першага пытання, рэпрэзентацыя чальцоў Выбарчай камісіі. Калі вы не супраць, я буду проста называць вашы імёны, а вы коратка рэпрэзентуйце сябе самі для нашых гледачоў і будучых выбаршчыкаў і выбарчых суб’ектаў. Пачнем, Яраслаў Бекіш, з цябе.
**Яраслаў Бекіш:** Добры вечар, мяне клічуць Яраслаў Бекіш, я быў таксама чальцом камісіі па выбарах мінулага складу Каардынацыйнай рады. Гэтым разам я быў намінаваны ад блока “Пракоп’ева-Ягорава”, яна ж фракцыя “Беларусы”. Добры вечар яшчэ раз.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, Яраслаў! Цяпер калі ласка Алена Жылачкіна (Жываглод).
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Две фаміліі ў меня заўсёды. Я вылучаная ад арганізацыі “Сумленныя людзі”. Я не была ў Выбарчай камісіі мінулым разам. Гэта мой першы раз.
**Алена Прыходзька:** Але я дадам, усё ж такі, што Алена мае досвед працы з выбарамі і ў межах працы ў “Сумленных людзях”, і таксама ў падрыхтоўцы мінулых выбараў Каардынацыйнай рады. Бо тады яна была сябрам Каардынацыйнай рады і прымала актыўны ўдзел ў падрыхтоўцы мінулых выбараў. Калі ласка, Пётр Маркелаў.
**Пётр Маркелаў:** Так, значыць, усім прывітанне. Пётр Маркелаў … [не чутна] грамадзянскай супольнасці, актывіст, намінаваны ад грамадзянскага руху Legalise Belarus. Ну, з досведу маю досвед працы ў рэвізійных органах Моладзевага блоку, Legalise Belarus і таксама маю досвед назірання за трыма выбарамі ў Беларусі. і рады далучыцца да працы Камісіі.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, Пётр, калі ласка, Дзмітрый Фурманаў.
**Дзмітрый Фурманаў:** Вітаю, шаноўнае спадарства, я зміцер Фурманаў, вылучаны фракцыяй “Моладзевы наступ” у гэтую выбарчую камісію. Таксама з’яўляюся тэхнічным менеджарам ў “Вольныя” і дата-спецыялістам у праваабарончым цэнтры “Вясна”.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй, Зміцер, пачула, як правільна звяртацца - не Дзмітрый, а Зміцер. Я прадстаўлюся сама. мяне завуць Алена Прыходзька, я журналістка і на мінулых выбарах у Каардынацыйную раду мінулага склікання я была сябрай Камісіі і Старшынёй Камісіі. У гэты склад мяне вылучала таксама фракцыя “Беларусы”. Прывітанне ўсім. Я яшчэ нагадаю, што нашае пасяджэнне, як і ўсе наступныя пасяджэнні, праводзяцца адкрыта, публічна праз відэасувязь і, адпаведна6 ход пасяджэння фіксуецца, запісваецца - як па відэасувязі запісваецца, таксама вядзецца пратакол гэтага пасяджэння, які адпаведным чынам будзе размешчаны потым на рэсурсах Каардынацыйнай рады. Ну і запіс пасяджэння таксама застанецца на відэарэсурсах Каардынацыйнай рады. А зараз мы пераходзім да азнаямлення з Устаноўчай дамовай. Як вы лічыце, калегі, ці мае сэнс агучваць увесь тэкст устаноўчай дамовы? Выказвайцеся калі ласка.
**Пётр Маркелаў:** Можа быць, проста ў агульных рысах апісаць, што за дамова і навошта яна?
**Дзмітрый Фурманаў:** Так, згодны са спадаром Пятром, можна агучыць асноўныя тэзісы і калі будуць нейкія пытанні ў гледачоў чаціку, то можна адказаць, калі будзе такая магчымасць.
**Алена Прыходзька:** Добра, пачула. Тады не буду зачытваць увесь тэкст. Скажу толькі, што чальцы Выбарчай камісіі падпісалі гэтую Ўстаноўчую дамову, якая, па сутнасці, з’яўляецца нашым добраахвотным пагадненнем прыняць удзел у якасці сбраў Камісіі, прыняць на сябе адпаведную адказнасць. І поўны тэкст гэтай дамовы будзе размешчаны на адпаведных рэсурсах Каардынацыйнай

рады, таму можна будзе з ёй азнаёміцца літаральна заўтра. Таксама, апроч устаноўчай дамовы, мы распрацавалі таксама некалькі важных дакументаў, якія рэгулююць працу і ўдакладняюць працу нас як сябраў камісіі і пра гэта мы пагаворм трошачкіпазней, калі вы не супраць. І з першым пытаннем мы скончылі і можам рухацца далей. Ці ёсць пытанні або ўдакладненні?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Няма пытанняў.
**Алена Прыходзька:** Тады пераходзім да іншага пытання і на ім мы паведамім асноўную інфармацыю пра выбары ў Каардынацыйную раду чацвёртага скліканння. Па-першае, асноўным дакументам, які рэгулюе ход гэтых выбараў, з'яўляецца прынятае Каардынацыйнай радай Палажэнне аб выбарах, і ўсім патэнцыйным выбарчым суб'ектам, якія збіраюцца ісці на гэтыя выбары, я вельмі раю азнаёміцца з гэтым дакументам. Ён ужо размешчаны на сайце Каардынацыйнай рады. Ад сябе хачу адзначыць, што выбары  - гэта не толькі некалькі дзён галасавання, а ў дадзенай кадэнцыі яно будзе праводзіцца тыдзень, а цэлы комплекс электаральных і юрыдычных працэдур, адказнасць за якія мы бярэм на сябе. Затым, з 10 па 31 сакавіка роўна тры тыдні будзе ісці этап падачы дакументаў на рэгістрацыю ў якасці выбарчага суб'екта. Нагадаю, што ў Каардынацыйную раду абіраюцца не асобныя дэлегаты, а менавіта калектывы, фактычная, як партыі. Гэтыя калектывы называцца "выбарчымі суб'ектамі", да іх ёсць шэраг патрабаванняў, якія таксама падрабязна прапісаны ў Палажэнні аб выбарах. Калі ў вас на этапе фармавання спісаў будуць з'яўляцца пытанні, вы зможаце звярнуцца па кансультацыі да Выбарчай камісіі. На пасяджэннях Камісіі, якія будуць праводзіцца адкрыта не радзей за раз на два тыдні, мы будзем дадаткова інфармаваць пра неабходныя абставіны правядзення выбараў, з пратаколамі пасяджэнняў вы таксама зможаце азнаёміцца. У пасяджэннях таксама могуць прымаць удзел па запыце  назіральнікі, журналісты, чальцы Каардынацыйнай рады. Адно толькі, гэтыя асобы не будуць мець права голасу. Вяртаючыся да выбарчых суб'ектаў, нагадаю, што мінімальны спіс асобаў у ім павінен утрымліваць не менш за 10 чалавек, сярод якіх не менш за 40 адсоткаў асобаў, менш рэпрэзентаванага полу. Калі спросціць, то маецца на ўвазе, што ў спісе кандыдатаў выбарчага суб'екта мусіць быць не менш за 40 адстокаў жанчын і не менш за 40 адсоткаў мужчын. З пытаннямі па фармаванні спісаў - звяртайцеся да Выбарчай камісіі. Выключэнні для выканання гэтай квоты прадугледжаны для спецыфічных выбарчых суб'ектаў, кшталту арганізацый добраахвотнікаў, ветэранскіх арганізацый - там квота зніжана да 20 адсоткаў, але такія арганізацыі павінны прыкласці доказы таго, што па родзе сваёй дзейнасці або па нейкіх аб'ектыўных чынніках выканаць гэтую квоту не могуць. У мінулых выбарах гэтая норма была і застаецца на гэтых выбарах. Цягам усяго выбарчагга перыяду Камісія будзе разглядаць скаргі і павеамляць пра вынікі разгляду на адкрытых пасяджэннях. Галасаванне будзе праводзіцца праз лічбавую платформу. Адпаведныя звесткі і тэхнічныя матэрыялы будуць размешчаны на рэсурсах Каардынацыйнай рады. Ну і непарэдна галасаванне будзе доўжыцца адзін тыдзень - з 11-га па 17-га траўня праз лічбавую платформу. Пасля гэтага 18 траўня будуць абвешчаны папярэднія вынікі выбараў. Да 20-га траўня ўключна можна будзе іх абскардзіць. І далей, у залежнасці ад таго, ці будзе абскарджанне, Выбарчая камісія прыме канчатковае рашэнне па выбарах у перыяд з 21 па 23 траўня. Здаецца, усё. Калі, ці хто хоча нешта ўдакладніць або дадаць?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Прагучалі тэрміны і тэрмін для галасавання выбарцаў 11-17 траўня пазначаны. Мне здаецца важным падкрэсліць, што гэта папярэдні тэрмін. Будзе правільным сказаць, што мы маем амбіцыю правесці ўсю кампанію па выбарах, каб галасаванне адбылося 11-17 траўня, але важна, што мы як Выбарчая камісія будзем упэўненыя, што выбары адбудуцца ў гэтыя даты, калі мы заключым дамову з правайдэрам лічбавай платформы для галасавання ў адпаведнасці з тэхнічным заданнем і атрымаем пацвярджэнне, што галасаванне можна будзе ажыццявіць у гэты тэрмін. І таксама, таймінг, які агучыла Алена, мы яшчэ апублікуем, усё гэта будзе на крыніцах Каардынацыйнай рады. А гэта наша задача ўжо даць гэты таймлайн.
**Алена Прыходзька:** Ну так. І калі па нейкіх прычынах будуць узнікаць іншыя абставіны, тэрміны змяняцца або ўдакладняцца, то мы таксама будзем своечасова паведамляць пр гэта. таму сачыце за апдэйтамі. Скажыце, калегі, ці ёсць яшчэ заўвагі ці дапаўненні?
*Заўваг не паступіла*

**Алена Прыходзька:** Дзякуй, заўваг няма. Тады мы пераходзім да іншага пытання. Гэта ў нас зацвярджэнне Рэгламента працы Выбарчай камісіі. Ці мае сэнс зачытваць тэкст цалкам, або можна асноўную інфармацыю даць?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Мне падаецца, што не трэба. Дакумент будзе апублікаваны і ўсе ахвочыя змогуць яго прачытаць.
**Алена Прыходзька:** Пагаджуся, дадам толькі, што ў Рэгламенце больш падрабязна распісаны асноўныя пункты працы і абавязкі. У тым ліку Выбарчай камісіі. Таксама там пазначаны тэрміны, адрас паштовай скрыні для афіцыйнай камунікацыі і іншыя працэдурныя пытанні, якія патрабавалаі рэгулявання. Скажыце, ці ўсе згодны з тэкстам і з тым, што мы прамовілі па гэтай тэме.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Згодны.
**Пётр Маркелаў:** Так. Хіба што там пазначана канкрэтная дата выбараў. То бок пункт 20. То бок гэта азначае, што выбары праводзяцца з 11 па 17 траўня, 7 поўных дзён. Так, мы гэта падпісваем, але ўжо была агаворка, што ў выпадку немагчымасці рэалізаваць гэтыя планы, якія мы маем, у прыватнасці, тое тэхнічнае заданне, над якім мы зараз працуем. Ужо цягам, можа быць заўтра, я ўжо дашлю чарнавік, драфт, і: спадзяюся, мы ўсё ж такі паспеем гэта ўсё імплементаваць іпадрыхтаваць сістэму да гэтага часу.
**Алена Прыходзька:** Я ўдкладню, каб гледачам было зразумела, пра што ідзе гаворка. Гаворка вядзецца пра тое, што Пётр складае тэхнічнае заданне для Правайдэра, для той платформы, для каманды, якая будзе кіравайь гэтай платформай і ажыццяўляць тэхнічнае забеспячэнне. І пакуль мы не атрымалі з таго боку адказы на нашы запыты, ёсць пэўная няўпэўненасць у тым, што гэта ўсё магчыма выканаць, паколькі не ўсё залежыць ад Выбарчай камісіі. Мы імкнемся даць найбольшай колькасці прагаласаваць, зрабіўшы гэта бяспечным для людзей. У крайнім выпадку, тэрміны выбараў будуць пасунуты. Ці нармальна я патлумачыла, скажыце калі ласка?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Нармальна-нармальна патлумачыла. Мы падпісваемся пад гэтыя тэрміны, робім усё, што можна зрабіць, каб зрабіць выбары, і ўсю кампанію, і галасаванне з 11-га па 17-га. Усё так. Але ёсць рэмарка. І на наступнае або праз адно пытанне на пасяджэнні мы абмяркуем Мемарандум, каб усё стала яшчэ больш зразумелым.
**Алена Прыходзька:** Ну, тады калі па гэтым пытанні мы вызначыліся, то можам пераходзіць да наступнага пытання - зацвярджэнне палажэння аб абранні старшыні Выбарчай камісіі. Гэта дакумент, які мы распрацавалі на этапе падрыхтоўкі да першага пасяджэння. Ён рэгулюе працэдуру абрання Старшыні Выбарчай камісіі. Ці будзем яго зачытваць, калегі, або толькі асноўную інфармацыю.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я думаю, дастаткова пра логіку галасавання, каб было зразумела, што будзе адбывацца. Што ёсць кандыдатуры, вылучэнне.
**Алена Прыходзька:** Ну, тады, логіка тут простая. Кожны з чальцоў выкажацца наконт таго, якую кандыдатуру вылучыць - сваю або іншага з калег. Потым адбудзецца працэс галасаванне. Яно будзе таемным, ніхто з нас не будзе ведаць, хто і як прагаласаваў. Галасаваць мы будзем праз тэлеграм-канал праз адпаведны чат з апытаннем. І абвесцім пра гэта зараз. Галасаванне будзе ў рэжыме рэальнага часу. Калі ласка, можам пачаць абмркоўваць кандыдатуры на пасаду Старшыні камісіі. Хто хоча пачаць прапаноўваць?
**Дзмітрый Фурманаў:** Я хачу спачатку не прапанаваць кандыдатуру, а задаць пытанне, ці патрэбна нам яшчэ пасада намесніка ці намесніцы старшыні камісіі? Дзякуй.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Мы пра такое не думалі, Зміцер. Мне падаецца, не. Хіба, калі штосьці здарыцца са Старшынёй… не ведаю. Калі нас ўсяго пяцёра, то можа і не трэба.
**Дзмітрый Фурманаў:** Вось менавіта з гэтым сэнсам, што ў старшыні магчыма не будзе мажлівасці выконваць свае абавязкі і спатрэбіцца намесніца або намеснік. Таму прапаную ўвесці яшчэ такую пасаду ў нашу Выбарчую камісію, калі такое магчыма.
**Пётр Маркелаў:** У нас хіба ў Палажэнні, якое мы збіраемся прыняць, няма нічога такога на гэты конт? Наконт таго, што магчыма абраць новую старшыню ў выпадку, калі абраны чалавек не зможа выконваць сваю функцыю. Быць можа, мы зможам новага старшыню абраць, не? Ці як?

**Алена Жылачкіна (Жываглод):** … Каб зараз не было экспромта, што будзем рабіць. Я б прапанавала, калі ў нас ужо ёсць зацверджаны рэгламент абрання старшыні - зрабіць старшыню, а наступным разам зробім віцэ-старшыню на гэтую пасаду. У два этапы проста.
**Пётр Маркелаў:** Я проста шукаю вот в доке этом…
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Яго няма там. Гэта зараз прапанова.
**Алена Прыходзька:** У Палажэнні пра выбары старшыні гэтага няма. Ну я б тут пагадзілася з пятром, калі нешта здарыцца са старшынёй і па нейкіх прычынах не зможа выконваць свае абавязкі, то абіраецца большай колькасцю галасоў новы старшыня і камісія працуе далей. Бо абавязкі старшыні яны больш тытульныя і тычацца ў асноўным падпісаннем дакументаў. Ну і таксама ў старшыні ёсць пераважны голас на пасяджэннях пры роўнасці галасоў прыпрыняцці рашэнняў. У астатнім гэта такая ж роўная пасада і адказнасць, як і ў іншых.
**Пётр Маркелаў:** Справа ў тым, што ў дакуменце, па-ходу, няма нічога наконт пераабрання ці наконт дзеянняў у выпадку, калі абраны старшыня камісіі не зможа выконваць гэтыя функцыі. Можа так і трэба напісаць…
**Алена Прыходзька:** Можна, але логіка такая, калі няма чалавека, ён не можа выконваць свае абавязкі, то ў любым выпадку абіраецца новы чалавек.
**Пётр Маркелаў:** Ці сыходзіць, ці можа быць выкрадаюць яго. Будзем спадзявацца, што такога не адбудзецца, але выпадкі ўжо былі. Ну добра, проста ў дакуменце такога няма, але можам тэкстава ўсё запісаць, што калі чалавек не можа выконваць свае функцыі, то мы абіраем новага старшыню камісіі.
**Алена Прыходзька:** Што скажыце, спадарства, ці вырашылі мы гэтае пытанне?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Зараз абіраем старшыню, а далей ужо можна дадаць, што адбываецца, калі старшыня не зможа выконваць свае абавязкі. Ці адразу дадаць яшчэ адну персону, віцэстаршыню, а зараз абраць старшыню, як мы і планавалі.
**Алена Прыходзька:** І можна будзе яшчэ дадаць, я не ведаю, вотум недаверу старшыні, калі каманда лічыць, што старшыня не выконвае свае абавязкі або перавышае іх.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я проста думаю, што мы зараз абмяркоўваем такія вельмі дэталёвыя рэчы, у прамым эфіры, а ніхто не бачыў нават нашага гэтага рэгламенту абрання старшыні і пра што мы гаворым. То бок я б хацела абраць старшыню, бо гэта вельмі такі зараз тэхнічны момант мы абмяркоўваем і людзі не бачылі, што мы ўпісалі ў той рэгламент.
**Пётр Маркелаў:** Трэба спачатку, усё ж такі, прыняць гэты рэгламент, бо рэгламент, ён рэгламентуе выбары старшыні выбарчай камісіі. Спачатку нам трэба прыняць гэтае рашэнне пра палажэнне пра выбары старыні…
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Ці лічым мы, што рэгламент па абранні старшыні камісіі прыняты? Я прапаную, мы прынялі гэты рэгламент, абралі старшыню па ім, па гэтым рэгламенце, і абяром зараз, як анансавала Алена ўжо. А пасля першага пасяджэння мы абмяркуем, што зрабіць яшчэ, вотум недаверу, у нас проста пяць персон, ці яшчэ каго-небудзь на пасаду, ці што зробім. То бок зараз зрабіць па гэтым рэгламенце давайце проста спраўдзім, ці ўсе згодны з гэтым рэгламентам, які напісаны зараз? Я згодна, я па ім б зараз працавала. Пётр таксама, Зміцер, Яраслаў стаўце лайкі.
**Дзмітрый Фурманаў:** Таксама згодзен і таму зараз хачу перадаць слова Яраславу, таму што ён падымаў руку. Калі ласка, дзякуй вялікі.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Зам’ютан.
**Яраслаў Бекіш:** Прабачце, я падымаў руку, таму што думаў, што мы ўжо пераходзім да вылучэння кандыдатаў і кандыдатак. Калі мы падыходзім да гэтага моманту, то я б хацеў прапанаваць персанальна Алену Прыходзька на пасаду кіраўніцы Выбарчай камісіі.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я падтрымліваю кандыдатуру. Я думаю, усе зараз па калейцы мусяць сказаць, хто падтрымлівае, ці яшчэ каго вылучаем на пасаду.
**Алена Прыходзька:** Зміцер, калі ласка.
**Дзмітрый Фурманаў:** Так, таксама падтрымліваю вашу кандыдатуру, спадарыня Алена, і ўлічваючы Ваш досвед у папярэдняй кампаніі, таму згодны з гэтай пазіцыяй і з прапановай Вашай каныдатуры.
**Алена Прыходзька:** Пётр, калі ласка.

**Пётр Маркелаў:** Галоўнае, каб сама Алена была згодная. Мы та прагаласуем, канешне. Але найперш трэба атрымаць згоду самой кандыдаткі.
**Алена Прыходзька:** Дзякуй вялікі, і за давер, і за цёплыя словы на мой адрас. Так, я згодна, не буду фліртаваць або цану сабе набіваць. Я згодна, і калі няма іншых кандыдатураў і прапаноў, то мы можам тады перайсці ў наш чацік. Як мы дамаўляемся - мы праверым, што мы ўсё ж такі ў нашым чаціку і зробім там галасавалку і прагаласуем.
*Адбываецца галасаванне ў адмысловым чаце пасродкам ананімнага апытання.*
**Пётр Маркелаў:** Мы маем 4 галасы… Пяць галасоў "за".
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Усё, галасаванне адбылося. Алена, пяць галасоў "за". Кандыдатура Алена Прыходзька, віншуем Вас, Алена, з пасадай Старшыні Выбарчай камісіі.
**Яраслаў Бекіш:** Спачуваем зноў.
**Алена Прыходзька:** Не, ну слухайце, спачуваць акурат… дзякуй вялікі. Спачуваць тут няма чаму, мы ўжо з Вамі стасуемся, прынамсі, два тыдні і мне ўсё падабаецца. Калі спачуваць, то нам усім, бо ўсе выпрабаванні мы будзем праходзіць разам. Таму я, спадзяюся, што усё ў нас атрымаецца. Каманда ў нас вкельмі добрая, кожны са сваімі скіламі, і софт, і хард. І мне падаецца, у нас будзе добры такі дрымтым. Гэта я вам шчыра кажу, з павагай да вас як да людзей і да вас як прафесіяналаў. І яшчэ выбачайце, я тут з тэлефона выйшла, і вось у мяне перыядычна падвісае "ўключыць" і "выключыць" мікрафон. таму я, бывае завісаю на некалькі секунд. Такім чынам, зацвярджаю як старшыня пасяджэння сённяшняга, што албылося галасаванне за абранне старшыні выбарчай камісіі. Старшынёй камісіі абрана Алена Прыходзька, гэта я, і таксама адпаведнае рашэнне будзе зафіксавана ў пратаколе сённяшняга пасяджэння. І калі з гэтым пытаннем мы скончылі, то можам пераходзіць да анонса трохбаковага Мемарандума. Калегі, ці жадае хтосьці з вас анансаваць, што гэта за дакумент, навошта ён складаецца і якія мэты перад сабой мае.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я магу пракаментаваць. Гэта Мемарандум аб узаемадзеянні трох бакоў. Тры бакі, гэта Выбарчая камісія, Каардынацыйная рада і Правайдэр лічбавай платформы. Ні для нікога не скарэт, што кандыдатура лічбавага правайдэра гэта каманда Паўла Лібера, якую мы разглядаем найперш. ні для каго не сакрэт, што рэгулюе Палажэнне аб выбарах, за якое прагаласавала Каардынацыйная рада. Але, калі мы ўзяліся за працу, то зразумелі, што для гэтых трох бакоў ёсць гэпы, прабелы, плямы, недакладнасці. І таму мемарандум мэтай перад сабой ставіць зафіксаваць дамоўленасці і прынцыповыя ролі гэтых трох бакоў. Што Каардынацыйная рада адказвае за матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці Выбарчай камісіі і Правайдэра таксама. Забяспечвае Выбарчую камісію магчымасцю рахмяшчаць нашыя пасты, анонсы, рашэнні на рэсурсах Каардынацыйнай рады. Што правайдэр адказвае за бяспеку даных, за бесперабойную працу платформу. То бок гэта Мемарандум на тры бакі ў мэтах даць празрыстасць і гарантавана акрэсліць, хто за што адказвае між намі трыма. І гэты мемарандум мы распрацавалі толькі ўнутры Камісіі, мы яго дашлем Правайдэру і Каардынацыйнай радзе. Пасля будзе абмеркаванне, дыялог, прыняцце і апублікаванне. Гэта прапанова замацаваць, хто за што адказвае. Бо зараз ёсць, асабліва ў мяне, незапакоенасць, што мы бярэмся за працу, ведаючы, што лічбавая платформа гэта адзін з галоўных складнікаў жлектаральнай кампаніі. і таму трэба разумець, хто ад каго чаго чакае, каб не было незразумелых чаканняў. Таму я думаю, што сёння ці заўтра мы дашлем і ў Каардынацыйную раду і Паўлу Ліберу гэты мемарандум і будзем публікаваць, калі ён будзе падпісаны.
**Яраслаў Бекіш:** Яшчэ хачу дадаць, што гэта з нашага досведу мінулага выбарчага сезону, калі і грамадства, і, часам, чальцы камісіі, і журналіст, праз тое, што не дакладна разумелі, хто за што адказвае ў выбарчым працэсе, звярталіся не па адрасе са сваімі пытанні і прапановамі, і гэтым разам мы вырашылі адразу гэтыя пытанні зняць. Выбарчая камісія адказвае за працэдуры і за якасць правядзення гэтых працэдур. Правайдэр, зразумела, збор, апераванне, захоўванне і на нейкім этапе выдаленне дадзеных удзельнікаў галасавання, Каардынацыйная рада адказвае за тое, каб камісія і правайдэр мелі ўсё неабходнае для працы, у тым ліку магчымасць выходзіць у эфір. Вось такая простая штука, нам яе не хапіла на пачатку выбарчага працэсу. Мы гэта адзначылі. Хацелі б, каб усе кропкі над "і" стаялі. Усё. То бок проста хацім зафіксаваць дамоўленасці паміж намі.

**Алена Прыходзька:** Я ад сябе дадам яшчэ, што ў нас у камандзе ёсць тэхнічныя спецыялісты, прынамсі, Пётр і Зміцер. І гэта вельмі ўзмацніла нас як камісію. Тыя тэхнічыныя змены, што адбываюцца з боку правайдэра адносна змены падрадчыкаў ці яшчэ кагосці, влсь дзякуючы таму6 што ў нашай камандзе ёсць людзі дасведчаныя, мы ставім слушныя пытанні і хочам6 каб гэта ўсё было правільна ўрэгулявана. каб мы разумелі, як усё адбываецца, і каб не маглі ўводзіць выбаршчыкаў у зман адносна тэхнічнага чынніка выбараў і працэдур, якія на баку Каардынацыйнай рады ў тым ліку. Вось, гэта я напэўна больш зараз кажу нашым бакам, прадстаўнікам Каардынацыйнай рады, ад якой мы чакаем падпісання Мемарандума, і каманды паўла Лібера. Яшчэ раз далучуся да калегаў. Гэта не нашая спроба перавагу сваю паказаць, але нам падаецца, такі дакумент толькі ўзмацніць і ўрэгулюе адказнасць бакоў. калі ўсе выказаліся па гэтым пытанні. то тады на сёння ўжо ўсё.
**Пётр Маркелаў:** Можа пару слоў скажу пра падыход да таго, як мы хочам гэтыя выбары правесці. У плане тэхнічным, якія дакументы мы хочам прымаць. Усё гэта пакуль мусіць прыняць форму тэхнічнага задання, што будзе хутка зроблена. Пасля мы зможам канчаткова пра гэта паведаміць. А пакуль патлумачу, што мы хочам прымаць беларускій пашпарты, дзейныя або нядзейныя. Мы хочам прымаць пашпарты новай Беларусі, хочам прымаць віды на жыхарства заежных краінаў, дзе пазначана беларускае грамадзянства. Такім чынам мы пакрываем амаль усіх людзей. З агаворкай, што кожны беларус, у якога няма дакументаў, зможа раэлізаваць права галасаваць праз пашпарт Новай Беларусі. Калі ў вас няма дзейнага пашпарту або внж іншай краіны, то бок гэта тыя дакументы, якія будуць у аўтаматычным рэжыме прымацца і апрацоўвацца знешнім правайдэрам верыфікацыі, які прайшоў шмат розных аўдытаў і мае сертыфікацыі, дзе праца з данымі прымаецца на высокіх стандартах, і ў дадатак да гэтага мы яшчэ зможам прымаць пашпарты Новай Беларусі. Да прыкладу, палітвязні, якія нядаўна вызваліліся. Мы ведаем, што шмат каму не аддалі пашпарты, няма ВНЖ. Яраслаў ідэю агучваў, каб мы паспрыялі працэсу атрымання пашпарту Новай Беларусі. Бо час яшчэ ёсць, яшчэ больш за два месцы, амаль тры месяцы. Ну і можна адразу сказаць, што з вялікай верагоднасцю мы зможам прымаць пашпарты Новай Беларусі. Але трэба зафіксаваць, што можна звярнуцца да беларускага пашпартнага цэнтру, каб выдалі гэтыя пашпарты. Магчыма такая магчымасць з’явіцца атрымаць дакументы.
**Яраслаў Бекіш:** Дзякуй, Пётр. Спадарыня, алена, як старшыня камісіі, я думаў, Вы па гэта скажаце. Ну калі можна, то я агучу, што ад імя Выбарчай камісіі мы пакуль што ў эфіры, а пасля пісьмова, звяртаемся да арганізацый, датычных выдачы пашпартоў Новай Беларусі і просім для тых людзей, якія яшчэ не атрымалі дакумент і былі гвалтоўна выкінуты з Беларусі пасля таго як адбылі тэрміны ў беларускіх турмаў і не маюць дакументы, выдаць ім па запыце гэтыя пашпарты безкаштоўна, калі яны жадаюць скарыстацца гэтымі дакументамі для ўдзелу ў выбарах Каардынацыйнай рады. Я бачу, яшчэ рука ў Алены, я хацеў бы яшчэ адну тэму закрануць, але гэта ўжо па іншым пытанні.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Я турбуюся трохі, як прагучала. Пётр і Яраслаў пакуль кажуць пра нашыя амбіцыі, пра нашы планы. Дакладна мы можам сказаць, што будуць прымацца беларускія пашпарты, дзейныя і пратэрмінаваныя. А далей гэта ўжо наш план і прымаліся пашпарты Новай Беларусі і для людзей, якія былі прымусова дэпартаваны без дакументаў, і для тых, хто чакае дакументы, падаўшыся на міжнародную абарону. То бок гэта яшчэ план, які мы зможам пацвердзіць, я думаю, што праз тыдзень ці праз два, калі будзе адказ. Гэта план яшчэ. А то я турбуюся, што гэта так прагучыць і пойдзе далей.
**Яраслаў Бекіш:** Спачатку мы атрымаем адказ ад правайдэра, ці магчыма гэтымі дакументамі будзе карыстацца, бо гэта таксама патрабуе тэхнічных высілкаў. І калі так, то тады далей гэты план будзем разгортваць. Пра дакументы ўсё. Я хацеў бы яшчэ, з вашага дазволу, звярнуцца да журналістаў і прадстаўнікоў медыя. Я памятаю, як гэта адбывалася два гады таму, і бачу, як некаторыя паважаныя журналісты звяртаюцца з пытаннямі да чальцоў камісіі.Усе мы пяцёра з’яўляемся прадстаўнікамі адмысловага добраахвотнага органа па правядзенні выбараў і таму, калі ласка, не спрабуйце ставіць пытанні, як мы ставімся да выбарчых суб’ектаў, асабіста або як камісія. Не маскіруйце гэтыя пытанні, як некаторыя хітра ўмеюць гэта скіраваць, бо мы будзем старацца на іх не адказваць, або адказваць

так, як і мусім адказваць, што для нас усе выбарчыя суб’еты роўныя. Пакуль выбарчая кампанія не скончыцца, мы не будзем каментаваць іх праграмы, паводзіны. Усе гэтыя суб’екты для нас роўныя.
**Пётр Маркелаў:** Хацеў бы пад канец нагадаць, што калі ёсць нейкія пытанні, наконт таго, як прынцыпова будзе працаваць гэтая платформа для галасавання, то будзем паведамляць, апроч некаотрых тэхнічных дэталяў з матываў бяспекі. А што тычыцца асноўных прынцыповых пытанняў, у Выбарчай камісіі не будзе доступу да спісу персанальных дадзеных выбаршчыкаў. Калі будуць яшчэ якія пытанні, вы можаце накіроўваць іх на афіцыйную скрыню Выбарчай камісіі.
**Алена Прыходзька:** Я далучуся да таго, што Пётр сказаў. Бяспека выбаршчыкаў - гэта наш прыярытэт, як гэта было і ў мінулы раз. Гэта першасны і найважнейшы прыярытэт, які мы будзем выконваць. Кожны чалец камісіі з’яўляецца бесстаронні. І я яшчэ заклікаю і журналістаў, і выбарчыя суб’екты і ўвогуле ўсіх людзей не аказваць неправамернага ўмяшальніцтва ў дзейнасць Камісіі. Усе пытанні працы Камісіі вырашаюцца праз афіцыйны канал сувязі. Спробы ціску на чальцоў Камісіі мы будзем перасякаць і публічна агучваць. Разлічваю на ваша разуменне. І прашу ўлічваць, што мы зараз знаходзімся пад вялікім ціскам і таксама, магчыма, пад новымі крыміналнымі артыкуламі. Дзякуй.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Алена, чаму ты выключаеш мікрафон? Ужо можна развітвацца.
**Алена Прыходзька:** Ну, так. На гэтай пазітыўнай ноце пра новыя крымінальныя артыкулы ў роднай нашай Белаурсі… Яшчэ дадам з таго, што Яраслаў сказаў, што кожны з нас адкрыты для каментароў, пытанняў, калі супрацоўнікі медыя, блогеры маюць пытанні. Мы абсалютна адкрыты для гэтага. Нашая праца публічная і мы адпаведна таксама. Дзякуй усім вялікі, калегі, гледачы, слухачы. Паважаныя чальцы Каардынацыйнай рады, я як старшыня камісіі ад усёй камісіі дзякую вам за давер, які вы нам аказалі. Спадзяюся, што ў нас усіх трох бакоў атрымаецца правесці гэтыя выбары годна. Мы пра свае сур’ёзныя намеры заявілі, спадзяемся, што з Вашых бакоў гэта будзе таксама. На гэтым я абвяшчаю,,, ага, пытанні ў чаце ёсць. Пётр, калі ласка.
**Пётр Маркелаў:** Пытанне з чату. Як будзе весціся медыйная дзейнасць па асвятленні смога ходу правядзення выбарчай кампаніі?
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Алена завісла?
**Алена Прыходзька:** Я думаю, што гэта будзе прыкладна, як і мінулым разам. па-першае, гэта абавязак Каардынацыйнай рады своечасова інфармаваць. Са свайго боку Выбарчая камісія ўсе абвесткі, навіны будзе перадаваць Каардынацыйнай радзе для публікацыі на яе рэсурсах. У Выбарчай камісіі няма сваіх рэсурсаў ніякіх медыйных. Журналісты змогуць звяртацца да нас з запытамі. Але інфармацыя першасна на рэсурсах Каарджынацыйнай рады. Што тычыцца выбарчых суб’ектаў, заклікаем рыхтавацца загадзя. Мінулым разам, напрыклад, нямногія выбарчыя суб’екты скарысталіся магчымасцю скарыстацца платформай Паўла Лібера для размяшчэння звестак пра свой выбарчы суб’ект, што было ім не на карысць. То бок проста інфармацыю , фотаздымкі не перадалі своечасова. Таму кожны выбарчы суб’ект, дбайце пра агітацыю. Тут важнае пытанне яшчэ. Выбарчая камісія не нясе адказнасць за яўку. Мы можам паведамляць пра сам факт выбараў, прапаноўваць неабмежаванаму колу грамадзянаў прыняць удзел у галасаванні, але агітацыяй не займаемся. Наша адказнасць зрабіць транспарэнтны дэмакратычны працэс па максімальна дэмакратычных працэдурах, даць людзям магчымасць вылучыцца на выбары і прагаласаваць на гэтых выбарах.
**Яраслаў Бекіш:** Таксама дадам, з папярэдняга досведу. Дзякуй за пытанне, яно можа яшчэ тычыцца буйных імпрэзаў. У мінулы раз былі тры такія кропкі, дзе выбарчыя суб’екты маглі сябе паказаць і праявіць. першае - платформа Паўла Лібера, якая выкарыстоўвалася. Па другое - Белсат зрабіў у эфіры мерапрыемства. І была яшчэ канферэнцыя, якую Каардынацыйная рада арганізавала перад выбарамі з дэбатамі. Было шмат журналістаў. Выбарчая камісія такіх мерапрыемстваў не ладзіць. Выбарчая камісія арганізуе прэс-канферэнцыю па выніках галасавання, яу у мінулым годзе, і гэта адзінае мерапрыемства, якое мы намераны арганізаваць, калі будуць сродкі.
**Алена Прыходзька:** І я дадам спойлер. мне толькі што напісаў журналіст Еўрарадыё з прапановай ладзіць дэбаты. Дзякуй за зацікаўленасць да працэсу. Мы толькі за, чым можам, дапаможам. Будзем шчыра ўдзячныя, калі такіх магчымасцяў для выбарчых суб’ектаў будзе толькі больш. Пеця, ці ёсць яшчэ пытанні ў чаце?

**Пётр Маркелаў:** Не, такіх, на якія не адказалі, не было. Дзякуй, што адказалі на гэтае пытанне.
**Алена Прыходзька:** Ну, тады дзякуй усім вялікі. Завяршаем сённяшняе пасяджэнне афіцыйна. Усе дакументы, якія мы сёння агучылі, будуць размешчаны на сайце Каардынацыйнай рады. Там будзе паштовая скрыня Выбарчай камісіі office@radavoting.com, на якую можна звяртацца. Віншую ўсіх з добрым пачаткам. Веру ў тое, што ў нас усіх усё атрымаецца. Дзякуй вялікі.
**Алена Жылачкіна (Жываглод):** Дзякуй.
**Пётр Маркелаў:** Дзякуй.
**Дзмітрый Фурманаў:** Дзякуй.
**Яраслаў Бекіш:** Жыве Беларусь!
**Дзмітрый Фурманаў:** Жыве вечна!
**Пётр Маркелаў:** Жыве вечна!
**Алена Прыходзька:** Жыве вечна!

Пасяджэнне Выбарчай камісіі завершана ў 22 гадзіны 08 хвілін па мінскім часе (GMT+3)

**Старшыня Выбарчай камісіі** **Алена Прыходзька**